Из данных таблицы 1 и 2 однозначно следует, что ЭМИ системы Wi-Fi изменяет основные физические характеристики вод как индикаторов этих излучений. Это, в свою очередь, означает, что система Wi-Fi влияет как на воду, так и будет влиять на все природные водные системы, содержащие в своем составе воду (внутриклеточная и межклеточная вода).

Проведенные в работе исследования позволяют нам сделать следующие выводы. ЭМИ устройства Wi-Fi можно однозначно исследовать с помощью природного наиболее чувствительным с сверхслабого ЭМИ, к которым следует отнести и системы Wi-Fi. Изменения свойств воды ЭМИ Wi-Fi однозначно влияет на любые живые структуры (растения, животные и человека) через прямое изменение свойств воды внутри живой системы. Наши исследования показывают, что влияние ЭМИ Wi-Fi отрицательно влияет на все "живые структуры" и поэтому целесообразно внедрять устройства для биобезопасности, что сделает Wi-fi безвредным для слабых энергоинформационных процессов в природе.

**Список цитированных источников**

1. https://zaotravlenie.ru/izluchenie/vred-wi-fi.html
2. http://www.kakprosto.ru/kak-875865-vredno-li-wi-fi-izluchenie
3. http://mobile-dom.ru/internet/vreden-li-wi-fi-dlya-zdorovya
4. http://vrachmedik.ru/490-vred-wi-fi.html
5. http://otravleniya.net/izluchenie/vredno-li-izluchenie-ot-wifi-routera.html
6. http://classinform.ru/udk.html

УДК 81.373.23
***Серада М.С.***
***Навуковы кіраўнік: выклад. Капцова Ю.А.***

## СТРУКТУРНА-СЕМАНТЫЧНАЯ КЛАСІФІКАЦЫЯ МЯНУШАК У ДЫЯЛЕКТНАЙ МОВЕ

Мянушка (ацэначна-характарыстычнае найменне, характарыстычнае празванне, неафіцыйнае найменне) – адзінка антрапанімікі, назва, дадзеная чалавеку жартам, у насмешку або для канспірацыі [5, с. 65]. Мянушка – адна з найбольш старажытных антрапанімічных форм. Калі браць пад увагу нешматлікія сведчанні гістарычных помнікаў VI-X ст. (пераважна грэка-візантыйскіх), летапісы, якія прысвечаны старажытнаму перыяду Русі, а таксама на падставе супастаўлення роднасных славянскіх моў, можна лічыць, што да X ст. і ў X ст. ва ўсходніх славян (продкаў рускіх, украінцаў, беларусаў) асноўнай антрапанімічнай адзінкай было асабістае імя-мянушка [3, с. 97]. Да прыняцця хрысціянства яно было асноўнай адзінкай называння чалавека (яго называлі «рекло», «назвище»), якое акрэслівала індывіда паводле знешнасці *(Чарныш, Бяляк),* характару, парадку нараджэння ў сям'і. Некаторыя імёны былі звязаны з жывёльным і раслінным светам *(Кот, Жарабя, Бяроза).* “Такія празванні былі абумоўлены верай у боскасць жывых істот, якія адыгрывалі асаблівую ролю ў жыцці нашых продкаў”. Сучасныя мянушкі ўзнаўляюць старажытныя мадэлі наймення аб'екта-індывіда па характэрнай прымеце. Кожнаму з нас важна не толькі назваць чалавека, але і выдзеліць самыя важныя яго рысы, ацаніць яго, выразіць пачуцці. Гэтыя задачы і выконваюць мянушкі — неафіцыйныя ацэначна-характарыстычныя найменні чалавека, а таксама прадстаўнікоў пэўнай сям'і. Асабліва актыўна выкарыстоўваюцца такія празванні ў вясковым асяроддзі, дзе людзі не так строга

прытрымліваюцца этыкетных норм, дзе прынята адкрыта, востра, трапна, а часам і крыўдна ацэньваць чалавека. Неафіцыйныя найменні ўзнікаюць не столькі з патрэбы намінацыі асобы, колькі з неабходнасці праз імя паказаць фізічныя, псіхічныя, разумовыя, маральныя і сацыяльна-побытавыя якасці чалавека.

Сучасныя мянушкі ўзнаўляюць старажытныя мадэлі наймення аб'екта-індывіда па характэрнай прыкмеце. Такія празванні ў вясковым асяроддзі, дзе людзі не так строга прытрымліваюцца этыкетных норм, дзе прынята адкрыта, востра, трапна, а часам і крыўдна ацэньваць чалавека. У аснову імені-мянушкі лёг рэальны факт. Перш за ўсе, знешнасць, паводзіны ці характар чалавека з' яўляюцца падставай для ўзнікнення імені-мянушкі. Чалавек па нейкіх рысах можа асацыіравацца з якой-небудзь жывёлай, птушкай, рыбай ці прадметам. Узнікаюць такія найменні і ў сувязі з рознымі падзеямі ў жыцці чалавека, прафесіяй, заняткам, яго роляй у грамадстве. Таму ў імёнах-мянушках шырока адлюстроўваюцца ўсе бакі сямейнага, грамадскага і палітычнага жыцця чалавека. Менавіта па гэтаму імёны-мянушкі можна назваць своеасаблівым позіркам у мінулае [1, с.76].

Даволі пашыранай была традыцыя даваць мянушкі прыгонным. Яны нярэдка замацоўваліся за іх носьбітамі, а для наступных пакаленняў паступова станавіліся прозвішчамі *(Баран, Камар, Абібок, Вол, Сава, Мядзведзь і інш.).*

Безумоўна, што ў наш час многія носьбіты такіх нярэдка немілагучных і нават абразлівых прозвішчаў нічога агульнага з такімі найменнямі не маюць (у прозвішчах, як і ў імёнах, адсутнічае лексічнае значэнне). Калі спыніцца на канкрэтнай вёсцы, то без вулічнага прозвішча-мянушкі знайсці чалавека вельмі складана. Гэта тлумачыцца тым, што ў вёсцы бытуе толькі некалькі агульных прозвішчаў. Таму гэта будзе складанай справай, калі ты не ведаеш мянушку таго, каго шукаеш.

У гісторыі ўсходнеславянскіх народаў ёсць прыклады, калі калектыўныя мянушкі замацоўваліся за паселішчамі і ператвараліся ў афіцыйныя назвы населеных пунктаў (станавіліся тапонімамі). Калектыўнай мянушкай, утворанай ад назвы месца былога пражывання – *Раджалаўка, Кругаўлянка, Драбавец, Чудзінка, Чучавец, Марачак, Кукавец*, а іншы раз больш шырока – *Поляк, Хахол, Ліцьвін*, – часта вызначалі тых, хто знаходзіўся за межамі краіны. Між іншым, утвораныя ад такіх этнонімаў-мянушак прозвішчы часта сустракаюцца на даволі значнай адлегласці ад той мясцовасці, назва якой стала іх асновай.

У беларускай антрапаніміцы існуе вялікая колькасць класіфікацый мянушак, у аснову якіх пакладзены розныя крытэрыі. Так, напрыклад, абапіраючыся на матэрыялы слоўніка старажытна-рускіх асабовых уласных імён М.М. Тупікова, А.М. Селішчаў паспрабаваў даць класіфікацыю імён па значэнні асновы, у выніку чаго ім вылучана 19 груп [8, с. 108-114]:

1) абставіны з'яўлення новага члена сям'і (знойдзены, падкінуты, узяты ў іншых). Выяўленне чакання і нечакання дзіцяці. Пачуцці бацькоў;
2) прафілактыка;
3) сямейныя адносіны;
4) знешні выгляд, фізічныя недахопы;
5) уласцівасці;
6) сацыяльнае і эканамічнае становішча;
7) прафесія, заняткі, пасада;
8) месца жыхарства;
9) царкоўныя адносіны і элементы;
10) кплівыя мянушкі;
11) жывёлы;
12) птушкі;
13) насякомыя;

14) рыбы;

15) расліны;

16) ежа;

17) імёны і мянушкі па розных прадметах;

18) татарскія імёны;

19) імя народа.

Большасць імён, прыведзеных у класіфікацыі, датуецца XIV – XVII стст., меншая частка XI – XIII стст. І хоць многія з іх адпавядаюць прыкладам X ст., упэўненасці няма, што менавіта такімі яны ўсе былі да X ст.

Даследчыкі А.У. Суслава і А. В. Супяранская вылучаюць наступныя дзевяць груп імён-празванняў [9, с. 42-43]:

1) лікавыя імёны;

2) імёны, дадзеныя па колеры валасоў і скуры;

3) імёны, дадзеныя па іншых знешніх прыметах – росце, асаблівасцях целаскладу;

4) імёны, якія прысвойваліся ў залежнасці ад характару і паводзін дзіцяці;

5) імёны, у якіх адзначалася пажаданасць ці непажаданасць з'яўлення дзіцяці ў сям'і і іншыя абставіны;

6) імёны, якія надаваліся па часе нараджэння дзіцяці;

7) імёны, што ўзыходзілі да старажытных павер'яў. Гэта "дрэнныя, благія" імёны, якія быццам бы здольныя адганяць злых духаў, хваробы, смерць;

8) імёны, па якіх можна даведацца пра суседзяў, з якімі жылі ўсходнія славяне;

9) імёны, звязаныя з жывёльным і раслінным светам.

Большасць з пералічаных у прыведзенай класіфікацыі імёнаў-празванняў уяўляюць сабою простыя імёны, што ўжываліся ў народным асяроддзі.

М.В. Бірыла адзначае, што ў якасці мянушак маглі выкарыстоўвацца практычна ўсе імёны. Аднак фактычна пераважала лексіка наступных семантычных груп [3, с. 67]:

1) назвы свойскіх жывёл;

2) назвы дзікіх звяроў і грызуноў;

3) назвы членістаногіх (насякомых), павукападобных;

4) назвы свойскіх птушак;

5) назвы дзікіх птушак;

6) назвы рыб;

7) назвы частак цела і покрыва цела чалавека і жывёл;

8) назвы хвароб, траўм, паталагічных адхіленняў;

9) назвы прылад працы, прадметаў бытавога ўжытку і іх частак;

10) назвы тыпаў паселішчаў, пабудоў, агароджаў і іх частак;

11) назвы адзення, абутку, галаўных убораў;

12) назвы прадуктаў харчавання, напояў;

13) назвы асоб па прафесіі ці занятку і інш.

Нягледзячы на адрозненні, якія існуюць паміж старажытнымі і сучаснымі мянушкамі, лексіка-семантычны склад апошных блізкі да таго, што выкарыстоўваўся ў X ст.

Паводле дадзеных Н.І. Новік, у вёсцы Каплічы Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобласці вылучаюцца наступныя тэматычныя групы мужчынскіх мянушак [6, с. 21]:

1) па росце і целаскладзе;

2) па рысах твару;

3) па памерах і форме галавы, наяўнасці валасоў і іх колеры;

4) па вопратцы, якую носяць мужчыны, па прычосцы і асаблівасцях хады;
5) па рысах характару;
6) па фізічных асаблівасцях, паталагічных адхіленнях;
7) па разумовых здольнасцях, адукацыі;
8) па адносінах да працы;
9) па характары заняткаў чалавека ў вольны час;
10) па назвах прадуктаў харчавання;
11) па сваяцкіх адносінах і становішчы ў сям'і.

Мянушкі вёскі Запруды Кобрынскага раёна сістэматызуюцца ў наступныя групы, у аснове семантыкі якіх:

1) нематываваныя назвы;
2) розныя формы хрысціянскіх імёнаў;
3) характарыстыка паводзін чалавека, яго звычак, фізічных асаблівасцей, рысаў характару, фізічных недахопаў, знешняга выгляду, сямейнага стану;
4) зневажальнае значэнне;
5) назва былога месца пражывання;
6) назва прадстаўнікоў жывёльнага свету;
7) прадметы паўсядзённага быту;
8) назва раслiннага свету;
9) від / род заняткаў або прафесія;
10) прозвішча;
11) падабенства з вядомай асобай;
12) народнасць / нацыянальнасць.

Такім чынам, мянушкі ўжываюцца як яшчэ адно неафіцыйнае прозвішча да пэўнага канкрэтнага чалавека. Універсальнасць іх у тым, што яны не толькі канкрэтна называюць асобу, але і трапна характарызуюць яе па нейкай адметнай прыкмеце. Даследчыкі, сістэматызуючы мянушкі, падкрэсліваюць, што спецыфічнасць ужывання вулічных мянушак у параўнанні з літаратурнай мовай заключаецца ў тым, што ў народна-гутарковай мове яны выкарыстоўваюцца без удакладненняў і не спалучаюцца з тымі імёнамі, якія называюць. Вывучэннем антрапонімаў (уласных імёнаў людзей, імёнаў па бацьку, прозвішчаў, бытавых назваў, мянушак, псеўданімаў), іх паходжання, структуры, сацыяльнага функцыянавання і геаграфічнага пашырэння займаецца такі раздзел анамастыкі, як антрапаніміка (ад грэч. anthropos «чалавек» + onyma «імя»). Антрапанімія — сукупнасць уласных імён [5, с. 16].

**Спіс цытаваных крыніц**

1. Бірыла, М.В. Беларуская антрапанімія: Структура ўласных мужчынскіх імён / М.В. Бірыла. – Мінск: Навука і тэхніка, 1982. – 320 с.
2. Бірыла, М.В. Беларуская антрапанімія: Прозвішчы, утвораныя ад апелятыўнай лексікі / М.В. Бірыла. – Мінск: Навука і тэхніка, 1969. – 508 с.
3. Бірыла, М. В. Беларуская антрапанімія: Уласныя імёны, імёны-мянушкі, імёны па бацьку, прозвішчы / М.В. Бірыла. – Мінск: Навука і тэхніка, 1966. – 328 с.
4. Дыялектны слоўнік Брэсчыны / Склад. М. Аляхновіч [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – 294 с.
5. Мезенка, Г.М. Беларуская анамастыка: навуч. дапам. для студ. ун-таў / Г.М. Мезенка. – Мінск : Выш. школа, 1997. – 119 с.
6. Новік, Н.І. Матываваныя мужчынскія мянушкі / Н.І. Новік // Беларуская мова. – Вып. 20. – Мінск, 1993. – С. 20–26.
7. Слоўнік асабовых уласных імён / уклад. М.Р. Суднік; навук. рэд. А.А. Лукашанец. – 2-е выд., выпр. і дапрац. – Мінск : Бел. навука, 2005. – 176 с.
8. Селищев, А.М. Избранные труды / А.М. Селищев. – М., 1968. – 238 с.
9. Суслова, А.В. О русских именах / А.В. Суслова, А.В. Суперанская. – Л.: Лениздат, 1985. – 221 с.